**Тэма 11. Міжнароднае становішча і знешнепалітычная дзейнасць Рэспублікі Беларусь у 1991–1999 гг.**

1. Канстытуцыйна-прававыя асновы і важнейшыя прынцыпы беларускай знешняй палітыкі.
2. Міжнароднае прызнанне Рэспублікі Беларусь. Далучэнне да важнейшых міжнародных пагадненняў і актыўнасць у ААН.
3. Адносіны Беларусі з Расіяй і іншымі краінамі СНД.
4. Узаемаадносіны з заходнімі дзяржавамі.
5. Станаўленне партнёрскіх адносін з КНР.

**Літаратура**

Тихомиров, А. В. Внешняя политика Республики Беларусь (1991–2015 гг.) / А. В. Тихомиров. – Минск : БГУ, 2017. – 208 с

Снапкоўскі, У. Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: вучэбны дапаможнік: у 2 ч. / У. Е. Снапкоўскі. – Мн: БДУ, 2004. – Ч. 2. – 303 с.

Шадурский, В. Г. Культурные связи Беларуси со странами Центральной и Западной Европы (1945 – 1990-е гг.) / В. Г. Шадурский. – Мн.: БГУ, 2000. – 285 с.

Снапкоўскі, У. Е. Шлях скрозь стагоддзе: беларуска-польскія адносіны 1918–2017 гг. / У. Е. Снапкоўскі. – Мінск : БДУ, 2017. – 287 с.

1. 27 ліпеня 1990 г. сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР. Дэкларацыя абвясціла Рэспубліку раўнапраўным і незалежным членам сусветнай супольнасці. У жніўні 1991 г. Дэкларацыя набыла статус канстытуцыйнага закона. 10 снежня 1991 г. Вярхоўны Савет Рэспублік Беларусь дэнансаваў саюзны дагавор 1922 г. Ліквідацыя СССР была юрыдычна замацавана падпісаннем у снежні 1991 г. Белавежскіх пагадненняў Беларуссю, Расіяй і Украінай і Алмаацінскіх пагадненняў 12 былымі рэспублікамі СССР за выключэннем прыбалтыйскіх. З гэтага часу Беларусь стала дзейнічаць як суб'ект самастойнай міжнароднай палітыкі. Яна выйшла на міжнародную арэну як еўрапейская краіна з глыбокімі гістарычнымі традыцыямі дзяржаўнасці і знешняй палітыкі. Рэспубліка Беларусь у знешней палітыццы выступае як спадкаемніца дзяржаў, якія існавалі на працягу гісторыі на яе тэрыторыі: Полацкае княства, ВКЛ, БНР, БССР.

Да выжнейшых традыцый знешняй палітыкі беларускай дзяржаўнасці адносяцца: неабходнасць захавання суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі пры ўступленні ў федэратыўныя дзяржавы з іншаэтнічным дамінаваннем (Рэч Паспалітая); улік гістарычнага вопыту знаходжання беларускай дзяржавы ў складзе імперскіх дзяржаў з іншаэтнічным дамінаваннем (Рэч Паспалітая, Расійская імперыя, Савецкі Саюз); забеспячэнне непадзельнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці беларускай дзяржавы; улік фактару поліэтнічнасці і поліканфесійнасці народа Беларусі;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

важнасць збалансаванага і раўназначнага развіцця двух вектараў беларускай знешняй палітыкі – усходняга і заходняга.

2 кастрычніка 1991 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў Заяву «Аб прынцыпах знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь». У ёй пацвярджалася прыхільнасць краіны прынцыпам Статута ААН, Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, а таксама міжнародным абавязацельствам, якія былі прыняты Беларуссю ў адпаведнасці з падпісанымі ёй міжнароднымі дагаворамі. Адзначалася гатоўнасць Беларусі далучыцца да Заключнага акта НБСЕ, пачаць перагаворы аб знішчэнні ядзернай зброі і абвяшчэнні еўрапейскага кантынента бяз'ядзернай зонай. Прынцыпамі знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь абвяшчаліся агульнапрызнаныя прынцыпы і нормы міжнароднага права. Нейкіх нацыянальна адметных для Беларусі знешнепалітычных прынцыпаў Заява не сфармулявала.

Канстытуцыя Беларусі 1994 г. замацавала абавязацельствы дзяржавы зыходзіць з агульнапрызнаных прынцыпаў і норм міжнароднага права. Яны абвешчаны прыярытэтнымі над нацыянальным заканадаўствам. Агульназафіксаваныя нормы міжнароднага права, якія прызнае Рэспубліка Беларусь, зафіксаваны ў Статуце ААН, Хельсінкскім Заключным Акце 1975 г., Парыжскай хартыі для новай Еўропы 1990 г. Важнейшым прынцыпам знешней плітыкі Беларусі былі абвешчаны палажэнні аб ператварэнні яе ў без’ядзерную зону і нейтральную краіну.

Ва ўмовах незалежнай Рэспублікі Беларусь сфарміраваліся асноўныя прынцыпы беларускай знешняй палітыкі: 1) адпаведнасць знешнепалітычных мэт нацыянальным рэсурсам; 2) прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў і норм міжнароднага права; 3) развіццё ўсебаковага супрацоўніцтва з замежнымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі; 4) добрахвотрнасць уваходжання і ўдзелу ў міжнародных арганізацыях; 5) адданасць палітыцы паслядоўнай дэмілітарызацыі міжнародных адносін; 6) адсутнасць тэрытарыяльных прэтэнзій да памежных дзяржаў і непрызнанне тэрытарыяльных прэтэнзій да Рэспублікі Беларусь.

Стратэгічнымі мэтамі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь з’яўляюцца: 1) абарона суверэнітэту і незалежнасці дзяржавы; 2) абарона інтарэсаў грамадзян, грамадства і дзяржавы; 3) захаванне бяз’ядзернага статусу; 4) набыццё абвешчанага ў Канстытуцыі нейтральнага статусу.

Асноўныя задачы знешняй політыкі Беларусі: 1) стварэнне знешніх умоў для паляпшэння дабрабыту народа; 2) умацаванне плітычнага, эканамічнага, культурнага і духоўнага патэнцыялу дзяржавы; 3) раўнапраўная інтэграцыя Беларусі ў сусветную палітычную, эканамічную, навуковую, культурную, інфармацыйную прастору; 4) садзейнічанне пабудове стабільнага, справядлівага, дэмакратычнага светапарадку на прынцыпах міжнароднага права; 5) фарміраванне добрасуседскіх адносін з суседнімі дзяржавамі; 6) абарона правоў і інтарэсаў грамадзян Беларусі за мяжой.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Асноўныя прыярытэтныя напрамкі знешняй палітыкі Беларусі: 1) развіццё ўзаемавыгадных адносін з РФ; 2) развіццё стабільных адносін з ЕС і дзяржавамі, якія ў яго ўваходзяць; 3) умацаванне супрацоўніцтва з дзяржавамі СНД; 4) удзел у Еўразійскім эканамічным супольніцтве; 5) падтрыманне і развіццё сяброўскіх адносін з суседнімі дзяржавамі; 6) развіццё сяброўскіх адносін з усімі еўрапейскімі дзяржавамі з мэтай дасягнення Беларуссю статусу раўнапраўнага ўдзельніка еўрапейскіх інтэграцыйных працэсаў; 7) развіццё раўнапраўных адносін з ЗША; 8) развіццё ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з краінамі Азіі (ў першую чаргу з КНР, Індыяй), арабскага свету, Афрыкі; 8) павышэнне ўзроўню эканамічнага і палітычнага супрацоўніцтва з краінамі Лацінскай Амерыкі; 9) садзейнічанне павышэнню ролі ААН у свеце; 10) развіццё шматбаковага супрацоўніцтва па пытаннях міжнароднай бяспекі і раззбраення, ліквідацыі надзвычайных сітуацый, наступстваў аварыі на ЧАЭС; 11) супрацоўніцтва з НАТО па пытаннях мер даверу і бяспекі, барацьбы з тэрарызмам, барацьбы з нелегальнай міграцыяй; 12) супрацоўніцтва з Рухам недалучэння па пытаннях бяспекі.

2. Міжнароднае прызнанне Рэспублікі Беларусь пачалося са снежня 1991 г. Першымі дзяржавамі свету, якія прызналі незалежнасць Беларусі і ўстанавілі з ёй дыпламатычныя адносіны, былі Туркменістан (1 снежня), Украіна і Расія (8 снежня). За межамі СНД Беларусь першай прызнала Турцыя (16 снежня). ЗША прызналі Беларусь 27 снежня. На прцягу 1992 г. адбылося шырокае міжнароднае прызнанне Рэспублікі Беларусь. Гэты працэс працягваўся ў наступныя гады. Да 1999 г. Беларусь прызналі 137 дзяржаў, з іх 124 устанавілі з ёй дыпламатычныя адносіны. На канец 2015 г. Беларусь падтрымлівала дыпламатычныя адносіны з 174 дзяржавамі.

Па меры міжнароднага прызнання ў Мінску адкрываліся замежныя дыпламатычныя прадстаўніцтвы. У сакавіку 1992 г. у Рэспубліцы Беларусь дзейнічала толькі 4 дыпламатычныя прадстаўніцтвы замежных дзяржаў (пасольства ЗША, генеральныя Консульствы Польшчы, Балгарыі і Германіі), у чэрвені 1999 г. – 44, з іх 29 пасольстваў, 6 генеральных консульстваў, 9 пастаянных прадстаўніцтваў міжнародных арганізацый. У лютым 2016 г. замежныя дзяржавы былі прадстаўлены ў Беларусі 45 пасольствамі, 4 аддзяленнямі пасольстваў, 2 гандлёвымі прадстаўніцтвамі, 35 консульскімі аддзяленнямі (ўключаючы ганаровых консулаў), міжнародныя арганізацыі – 15 прадстаўніцтвамі. Па сумяшчальніцтву былі акрэдытаваныя 88 замежных дыппрадстаўніцтваў. Замежныя дыппрадстаўніцтвы размяшчаліся пераважна ў Мінску. Консульскія ўстановы (Консульствы і Генеральныя консульствы) замежных дзяржаў дзейнічалі ў Брэсце (Казахстан, Расія, Украіна), Віцебску (Латвія), Гродна (Літва, Польшча).

У сваю чаргу за мяжой адкрываліся дыпламатычныя прадстаўніцтвы Беларусі. У 1992 г. пасольствы Рэспублікі Беларусь з'явіліся ў Ізраіле, Польшчы ЗША, Францыі. У 1993 г. – у Аўстрыі, КНР, Латвіі, Літве, Расійскай Федэрацыі, Украіне, ФРГ. У 1994 г. – у Балгарыі, Вялікабрытаніі, Чэскай Рэспубліцы, у 1995 г. – у Японія, у 1996 г. – у Італіі. У 1997 г.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пасольствы Рэспублікі Беларусь былі створаны ў Канадзе, Турцыі. У пачатку XXI стагоддзя Беларусь працягвала пашыраць сетку сваіх дыпламтычных прадстаўніцтваў. У 2015 г. яна мела за мяжой 56 пасольстваў, 12 аддзяленняў пасольстваў, 2 пастаянных прадстаўніцтвы пры міжнародных арганізацыях, 9 генеральных консульстваў і консульстваў.

У сувязі з міжнародным прызнаннем Беларусі значна пашырылася дагаварная база яе міжнародных адносін з замежнымі краінамі і міжнароднымі арганізацыямі. На 1 ліпеня 2003 г. Беларусь ажыццяўляла выкананне 2701 міжнароднага дагавора. Беларусь значна пашырыла свой удзел у міжнародных арганізацыях. У 1992–1993 гг. яна ўступіла ў Міжнародны Валютны Фонд і Групу Сусветнага Банка, Міжнародную арганірзацыю грамадзянскай авіяцыі. З набыццём незалежнасці Беларусь праявіла цікавасць да ўступлення ў Сусветную гандлёвую арганізацыю і пачала адпаведныя перагаворы.

2 кастрычніка 1991 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь у спецыяльнай заяве аб асновах знешняй палітыкі Беларусі пацвердзіў прыхільнасць Беларусі прынцыпам Статута ААН і Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека 1948 г. і выказаў гатоўнасць далучыцца да іншым міжнародна-прававых актаў, якія Беларусь не магла прыняць у складзе СССР. У заяве таксама гаварылася аб жаданні Беларусі стаць паўнапраўным удзельнікам Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (НБСЕ). У 1992 г. у Мінску адкрылася прадстаўніцтва ААН. У гэтым жа годзе Беларусь была прынята ў Арганізацыю бяспекі і супрацоўнгіцтва ў Еўропе (АБСЕ). Яна падпісала Хельсінскі Заключны акт і Парыжскую хартыю для новай Еўропы. У 1994 г. у час сустрэчы кіраўнікоў АБСЕ ў Будапешце Беларусь, Вялікабрытанія, ЗША і Расія падпісалі пагадненне аб гарантыях бяспекі Беларусі.

Пасля набыцця незалежнасці памянялася роля Беларусі ў ААН. Раней беларуская дэлегацыя выконвала ролю дадатковага голаса СССР. Цяпер яна дзейнічала, зыходзячы з уласных нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў. Першай праявай саматойнасці Беларусі ў ААН стала прыняцце па ініцыятыве дэлеганцый тады яшчэ БССР, УССР і СССР рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі ААН па змякчэнню наступстваў аварыі на ЧАЭС. У 1997 г. па ініцыятыве Беларусі, Расіі і Украіны ААН распрацавала праграму міжнароднага садзейнічання тэрыторыям, пацярпеўшым у выніку чарнобыльскай катастрофы.

Беларускія дэлегацыі ўдзельнічалі ў шэрагу канферэнцый, якія праводзіліся пад патранажам ААН. У іх ліку канферэнцыя па навакольным асяроддзі ў Рыа-дэ-Жанэйра ў 1992 г., па правах чалавека ў Вене ў 1993 г., па народанасяленню ў Каіры ў 1994 г., па сацыяльным развіцці ў Капенгагене ў 1995 г. У рамках ААН Беларусь актыўна ўзнімала пытанні раззбраення. У 1998 г. Беларусь выступіла за безтэрмірновае падаўжэнне дзеяння дагавора аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі. У 1998 г. Генеральная Асамблея ААН прыняла рэзалюцыю, у якой утрымліваецца адабранне беларускай ініцыятывы па стварэнні бяз’ядзернай зоны ў Цэнтральнай і Усходняй

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Еўропе. На Генеральнай Асамблеі ААН у 1999 г. па ініцыятыве Беларусі была прынята рэзалюцыя аб забароне распрацоўкі і вытворчасці новых відаў зброі масавага знішчэння.

У 1995 г. у Мінску адкрыта прадстаўніцтва Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па бежанцах, у 1996 г. – пастаяннае прадстаўніцтва Міжнароднай арганізацыі па мігрантах. У рамках ЮНЕСКА для рэспублікі распрацоўваліся праграмы «Генетычная спадчына», «ЮНЕСКА – Чарнобыль», «Чалавек і біясфера», у краіне дзейнічае нацыянальная Камісія Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА, падпісаны мемарандумы аб супрацоўніцтве паміж Беларуссю і ЮНЕСКА.

3. Прыярытэтным напрамкам знешняй палітыкі Беларусі з'яўляюцца адносіны з Расіяй. У 1993 г. у адносінах паміж дзвюма краінамі паўстала пытанне аб аб’яднанні іх грашовых сістэм. У 1994 г. прэм’ер-міністры Беларусі і Расіі падпісалі адпаведнае пагадненне. Але з-за разыходжання бакоў па пытанні аб цэнтры грашовай эмісіі і статусе нацыянальных банкаў дагвор так і не ўступіў у сілу.

У 1994 г. з абраннем прэзідэнтам Беларусі А. Лукашэнкі быў абвешчаны курс на палітычную, эканамічную і ваенную інтэграцыю з Расіяй. На рэферэндуме 1995 г. большасць галасаваўшых выказалася за эканамічную інтэграцыю з Расіяй. У 1995 г. быў падпісаны беларуска-расійскі дагавор аб сяброўстве, добрасуседстве і супрацоўніцтве. Дагавор замацоўваў факт існавання Беларусі і Расіі як дзвюх незалежных суверэнных дзяржаў. У 1996 г. Беларусь і Расія падпісалі дагавор аб стварэнні Супольніцтва Беларусі і Расіі, а ў 1997 г. трансфарміравалі яго ў Саюз дзвюх краін. У 1999 г. Беларусь і Расія падпісалі дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. Дагавор прадугледжваў далейшыя крокі дзвюх дзяржаў па збліжэнню і аб’яднанню іх прававых, эканамічных, фінансавых, мытных і іншых сістэм. Намячалася фарміраванне міждзяржаўных структур улады. Расія і Беларусь зафіксавалі намер добраахвотна перадаць Саюзнай дзяржаве шэраг сваіх паўнамоцтваў з мэтай ажыццяўлення адзінай палітыкі. Намячалася стварэнне адзінай эканамічнай прасторы. Пры гэтым падкрэслівалася захаванне незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Расіі і Беларусі, іх канстытуцыйнага ладу, міжнародных абавязацельстваў. Дагавор 1999 г. прадугледжваў фактычна стварэнне канфедэрацыі Беларусі і Расіі. Кіруючым органам Саюзнай дзяржавы з’яўляецца Вышэйшы дзяржаўны савет Беларусі і Расіі, які складаецца з прэзідэнтаў дзвюх краін.

30 лістапада 2000 г. у Мінску на пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы былі падпісаны міждзяржаўнае пагадненне «Аб увядзенні адзінай грашовай адзінкі і фарміраванні адзінага эмісійнага цэнтра Саюзнай дзяржавы» і міжурадавае пагадненне «Аб мерах па забеспячэнні ўмоў для ўвядзення адзінай грашовай адзінкі». Яны прадугледжвалі, што з 1 снежня 2005 г. расійскі рубель стане адзінай валютай у абедзвюх краінах, а з 1 снежня 2008 г. планавалася ўвесці іншую грашовую адзінку, пры гэтым эмісійны цэнтр будзе знаходзіцца ў Маскве.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Адным з асноўных накірункаў развіцця двухбаковых адносін Рэспублікі Беларусь з Расійскай Федэрацыяй з'яўлялася гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва з расійскімі рэгіёнамі. На ўзроўні ўрада Беларусі з расійскімі рэгіёнамі на пачатак 2001 г. было заключана 23 пагадненні аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве.

Наладжванне супрацоўніцтва ў ваеннай сферы паміж Беларуссю і Расіяй ажыццяўляецца на аснове дагавора 1997 г. і Пагаднення аб сумесным забеспячэнні рэгіянальнай бяспекі ў ваеннай сферы. У 1998 г. у Маскве праходзіла пасяджэнне Вышэйшага савета Саюза Беларусі і Расіі. На ім была зацверджана канцэпцыя сумеснай абарончай палітыкі дзвюх дзяржаў. Была створана сумесная сістэма супрацьпаветранай абароны. Сваю знешнюю палітыку Беларусь і Расія ў рамках Саюзнай дзяржавы каардынуюць на аснове праграмы ўзгодненых дзеянняў у галіне знешняй палітыкі. Яна абнаўляецца кожныя два гады. Згодна праграме дзве дзяржавы каардынуюць свае дзеянні пры вырашэнні знешнепалітычных пытанняў.

У першыя гады незалежнасці адносіны паміж Беларуссю і Украінай не былі адзначаны высокай актыўнасцю. Гэта было звязана галоўным чынам з розным стаўленнем дзвюх дзяржаў да СНД. Украіна разглядала гэтую арганізацыю як форму цывілізаванага “разводу” для былых савецкіх рэспублік. Двухбаковыя палітычныя кантакты актывізаваліся пасля перамогі на прэзідэнцкіх выбарах ва Украіне ў ліпені 1994 г. Л. Кучмы. У ліпені 1995 г. прэзідэнт Украіны наведаў Рэспубліку Беларусь з першым афіцыйным візітам, галоўным вынікам якога стала падпісанне двухбаковага дагавора аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве. 12–13 мая 1997 г. прэзідэнт Рэспублікі Беларусь ажыццявіў першы афіцыйны візіт ва Украіну. У далейшым рабочыя сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў Беларусі і Украіны праходзілі неаднаразова.

Дыялог ажыццяўляўся гэтак жа на ўзроўні кіраўнікоў урадаў, прадстаўнікоў міністэрстваў і ведамстваў дзвюх краін. У 1996 г. Беларусь і Украіна стварылі міжурадавую камісію па пытаннях гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. У 1997 г. на мяжы Беларусі, Украіны і Польшчы быў створаны Еўрарэгіён "Буг", у склад якога з боку Украіны ўвайшлі Валынская і два раёна Львоўскай вобласці, а з боку Беларусі – Брэсцкая вобласць. Удзельнікі трансгранічнага аб'яднання сканцэнтравалі ўвагу на развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, рэалізацыі сумесных праектаў.

Важным прыярытэтным напрамкам знешняй палітыкі Беларусі з’яўляюцца адносіны з краінамі СНД у цэлым. З моманту стварэння гэтай арганізацыі Беларусь выступала за яе ператварэнне ў рэгіянальную арганізацыяю з высокім узроўненнем эканамічнай і палітычнай інтэграцыі. Аднак СНД з-за розных інтарэсаў яе членаў і цэнтрабежных працэсаў на постсавецкай прасторы не змагла стаць эфектыўным інструментам узгаднення інтарэсаў уваходзячых у яе краін. У яе рамках так і не ўтварылася адзінае палітыка-эканамічнае супольніцтва. Беларусь выступае за павышэнне эфектыўнасці рэгіянальных інтэрацыйных аб’яднанняў на постсавецкай прасторы. У пачатку 1994 г. Беларусь далучылася да Дагавора аб

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

калектыўнай бяспецы краін – удзельніц СНД. Ён быў заключаны краінамі СНД у 1992 г.

4. У першай палове 1990-х гг. паспяхова наладжваліся адносіны Беларусі з дзяржавамі Захаду. У 1992 г. Беларусь была прынята ў Савет паўночна-атлантычнага супрацоўніцтва, які з 1997 г. быў рэарганізаваны ў Савет еўраатлантычнага партнёрства. У тым жа 1992 г. Беларусь атрымала статус спецыяльна запрошанай дзяржавы ў Савет Еўропы, а ў 1993 г. падала заяўку на прыём у гэтую арганізацыю. У 1995 г. Беларусь падпісала дагавор аб партнёрстве і супрацоўніцтве і стала ўдзельнікам праграмы НАТО "Партнёрства дзеля міру". У 1998 г. пачала работу місія НАТО ў Беларусі. Пры гэтым кіраўніцтва Беларусі адмоўна ставілася да пашырэння НАТО на ўсход.

Наладжваліся адносіны са ЗША. У студзені 1994 г. адбыўся візіт у Мінск прэзідэнта ЗША Б. Клінтана. Ён сустрэўся з С. Шушкевічам і В. Кебічам, каб выказаць Беларусі ўдзячнасць за згоду дэманціраваць 81 стратэгічную ядзерную ракету і запэўніў беларускае кіраўніцтва ў амерыканскай падтрымцы правядзення эканамічных рэформ. Літаральна праз 10 дзён пасля візіту Б. Клінтана ў Мінск адбылася адстаўка С. Шушкевіча з пасады старшыні Вярхоўнага Савета. У ЗША гэта было ўспрынята як адмоўны фактар для развіцця беларуска-амерыканскіх адносін.

Важным эканамічным і палітычным партнёрам Беларусі з моманту набыцця назалежнасці стаў Еврапейскі Саюз. У сакавіку 1996 г. адбыўся візіт у Брусель прэзідэнта Беларусі А. Лукашэнкі. 6 сакавіка было падпісана пагадненне аб партнёрстве і супрацоўніцтву паміж Рэспублікай Беларусь і ЕС. Парламент Беларусі ратыфікаваў пагадненне, а ў ЕС яго ратыфікавалі толькі 8 краін, таму ў сілу яно не ўступіла. 26 сакавіка 1996 г. было падпісана Часовае пагадненне паміж Рэспублікай Беларусь і ЕС аб гандлі. Гэтае пагадненне таксама не было ўведзена ў дзеянне. Але, нягледзячы на гэта, ЕС прадаставіў Беларусі рэжым найбольшага спрыяння ў гандлі. Таксама ЕС прымяняў да Беларусі сістэму мытных ільгот у гандлі. У адпаведнасці з імі беларускія тавары імпартаваліся ў ЕС бязпошліна ці па зніжаных мытных стаўках. ЕС стаў другім знешнеэканамічным партнёрам Беларусі. У 2000 г. на яго прыходзілася 13 % гандлёвага абароту Беларусі. Гандаль з ЕС для Беларусі ў 1990-я гады быў асабліва важны тым, што на ім наша краіна зарабляла цвёрдую валюту. У адрозненні ад гандлю з краінамі СНД, які часта ўяўляў сабою бартарные аперацыі. Акрамя таго, гандаль з ЕС даваў Беларусі высокатэхналагічную прадукцыю, якая неабходна для мадэрнізацыі беларускай эканомікі.

Наладжванню адносін Беларусі з Захадам спрыяў яе курс на адмову ад ядзернай зброі. Яшчэ ў 1990 г. міністр замежных спраў Беларусі П. Краўчанка вылучыў ініцыятыву аб стварэнні ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе бяз'ядзернай зоны. У 1992 г. быў падпісаны Лісабонскі пратакол, які прадугледжваў далучэнне Беларусі да Дагавора аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі ў якасці бяз'ядзернай дзяржавы. У 1996 г. з тэрыторы Рэспублікі Беларусь была цалкам выведзена ядзерная зброя і яна стала

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

нейтральнай бяз'ядзернай дзяржавай. Таксама Беларусь уключылася ў працэс скарачэння няядзернай зброі, далучыўшыся ў 1992 г. да Дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе. Беларуская армія была скарочана са 160 да 80 тыс. чалавек.

З 1996 г. адносіны з краінамі Захаду ўскладніліся. Савет Еўропы прыпыніў статус спецыяльна запрошанай краіны. Краіны Еўрапейскага Саюзу звялі палітычныя кантакты з РБ да мінімуму, але эканамічныя сувязі ў асноўным захаваліся. Пры гэтым ЕС увязваў развіццё эканамічных адносін з Беларуссю з выкананнем яе ўрадам шэрагу палітычных умоў: забеспячэнне свабоды друку, змяненне адносін да апазіцыі. Савет Еўропы заявіў аб непрызнанні створанага ў 1996 г. Нацыянальнага сходу ў якасці парламента Беларусі. Выбары мясцовых органаў улады (1999 г.), Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу (2000 г.) і Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2001 г.) не былі прызнаны паводле стандартаў АБСЕ справядлівымі і дэмакратычнымі. Таксама ЕС вылучаў патрабаванне правядзення ў Беларусі рынкавых рэформ. Таксама ЕС увёў візавыя абмежаванні для шэрагу дзяржаўных кіраўнікоў Беларусі. Гэтае рашэнне было адменена ў 1999 г. У сувязі з падзеямі, звязанымі з правядзеннем рэферэндуму і дзяржаўнай рэформы восенні 1996 г. не уступілі ў дзеянне Пагадненне аб партнёрстве і супрацоўніцтве і Часовае пагадненне аб гандлі паміж Беларуссю і ЕС. ЗША аб'явілі палітыку «выбарчага дыялога», якая прадугледжвала спыненне кантактаў з беларускім кіраўніцтвам і падтрымку інстытутаў грамадзянскай супольнасці ў Беларусі. Разам з тым Захад заявіў, што яго мэтай не з'яўляецца ізаляцыя Беларусі, а вяртанне яе ў сям'ю цывілізаваных еўрапейскіх краін, на шлях дэмакратыі і рыначных рэформ. Адмоўна на адносіны Беларусі з Захадам паўплывала яе негатыўнае стаўленне да пашырэння НАТО на ўсход. У 1999 г. у склад блока увайшлі першыя з былых сацыялістычных краін Чэхія, Венгрыя, Польшча. Гэта выклікала негатыўную рэакцыю Беларусі. Адносіны з НАТО пагоршыліся ў 1999 г. і ў сувязі з ваеннай акцыяй блока супраць Югаславіі. Беларусь і Расія ўнеслі ў Савет Бяспекі ААН востры праект рэзалюцыі з асуджэннем інтэрвенцыі. Аднак ён не атрымаў шырокай падтрымкі. Напрыканцы 1999 г. Беларусь услед за Расіяй аднавіла афіцыйныя кантакты з НАТО.

Сярод дзяржаў Захаду для Беларусі асаблівае значэнне маюць адносіны з суседнімі дзяржавамі – Польшчай, Літвой, Латвіяй. Праз гэтыя краіны праходзяць важныя для знешнеэканамічнай дзейнасці Беларусі гандлёвыя шляхі. У іх прадстаўлена значная беларуская дыяспара. У першай палове 1990-х гадоў ішло дастакова паспяховае наладжванне даносін з пералічанымі краінамі. З імі былі падпісаны палітычныя дагаворы і дэкларацыі, а таксама дагаворы аб дзяржаўнай мяжы. Яны замацавалі існаваўшыя паміж дзяржавамі рэгіёна граніцы. У прыватнасці, яшчэ ў кастрычніку 1991 г. быў падпісаны дагавор паміж Беларуссю і Польшчай, па якім бакі пацвердзілі граніцу , што была ўсталявана пагадненнем СССР з Польшчай ад 16 жніўня 1945 г. У кастрычніку 1991 г. была падпісана і Дэкларацыя аб прынцыпах добрасуседскіх адносін з Літвой, у якой бакі пацвердзілі непарушнасць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

беларуска-літоўскай граніцы. Актыўна падтрымліваліся міждзяржаўныя кантакты, у тым ліку і на вышэйшым узроўні. У 1996 г. адбылася сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Польшчы. У другой палове 1990-х гадоў адбываецца пэўнае ахалоджанне адносін Беларусі с Польшчай, Літвой і Латвіяй.

5. Дыпламатычныя адносіны паміж Рэспублікай Беларусь і КНР установлены 20 студзеня 1992 г. Палітычны дыялог з гэтай краінай адрозніваўся павышанай актыўнасцю і захоўваў канструктыўны характар. У 1995 і 1997 гг. адбыліся візіты прэзідэнта Беларусі А. Лукашэнкі ў Кітай. У 1995 г. у Беларусі з візітам знаходзіўся старшыня Дзяржсавета КНР Лі Пэн. Рэспубліка Беларусь паслядоўна прытрымлівалася канцэпцыі "адзінага Кітая". Афіцыйны Мінск вітаў аднаўленне дзяржаўнага суверэнітэту КНР над Ганконгам (Сянганам) у 1997 г. і Макао ў 1999 г., устрымліваўся ад афіцыйнага прызнання Рэспублікі Кітай на Тайвані і не падтрымліваў сепаратысцкія плыні ў Тыбеце і Сіньцзян-Уйгурскай аўтаномнай акрузе КНР. Кітай уваходзіў у дзясятку найбуйнейшых знешнегандлёвых партнёраў Беларусі. У 1992–2000 гг. аб'ём беларуска-кітайскага тавараабароту павялічыўся з 33,9 да 183 млн дал. ЗША.

У другой палове 1990-х гг. Беларусь і Кітай прыступілі да рэалізацыі сумесных вытворчых праектаў. Па стане на 2001 г. у Рэспубліцы Беларусь было зарэгістравана 47 прадпрыемстваў з удзелам кітайскага капіталу. У сваю чаргу ў канцы 2000 г. у Кітаі было зарэгістравана 12 прадпрыемстваў з беларускімі інвестыцыямі. Найбольш значным з гэтых прадпрыемстваў стала «Саньцзян – Волат», створанае вясной 1998 г. у правінцыі Ухань пры садзейнічанні Мінскага завода колавых цягачоў. Прадпрыемства ажыццяўляла выпуск грузавых аўтамабіляў, прызначаных для выкарыстання ў цяжкапраходных раёнах, дзе здабываліся нафта і прыродны газ. Актыўнасць на кітайскім напрамку праяўлялі беларускія прадпрыемствы «Інтэграл», «Гомсельмаш», «БелАЗ», Мінскі мотавелазавод, Мінскі трактарны завод.

У другой палове 1990-х гг. актывізаваліся адносіны Беларусі з краінамі Азіі і Арабскага Усходу. Падчас візітаў А. Лукашэнкі ў Індыю, В'етнам, Сірыю, Егіпет і іншыя краіны Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна разглядаліся пытанні ўмацавання двухбаковых палітычных, гандлёва-эканамічных і ваенных сувязей. На думку беларускага кіраўніцтва, найбольш прадуктыўнае супрацоўніцтва з гэтай групы дзяржаў развіваецца з Індыяй і В'етнамам.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ